WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 КРАСАВІКА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 75
(26939)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НА СЯЎБЕ — АВІЯГРУПА АГРАКАМБІНАТА

У веснавой пасяўной кампаніі ў агракамбінаце «Зара» Магілёўскага раёна працуе авіягрупа. Самалёты абыходзяцца сельскай гаспадарцы нятанна, але канчатковы вынік апраўдвае выдаткаваныя на авіяцыю сродкі.

Цяпер штодзень выконваецца некалькі дзясяткаў палётаў: нядаўна ўносілі мінеральныя ўгнаенні для азімых культур, зараз падкормліваюць шматгадовыя травы. Узрост самалётаў немалады — больш за 20 гадоў, але з дапамогай капітальных рамонтаў тэхніка працуе спраўна. На самалётах працуюць прафесійныя пілоты, якія жартам называюць саміх сябе «лятаючымі аграномамі».

Авіягрупу ў «Зары» стварылі пяць гадоў таму. Вядома, самалёты спажываюць больш паліва, чым трактары, але і выконваюць проста непараўнальна большы аб'ём. Між тым, магчымасць выканаць сельскагаспадарчыя работы пры дапамозе самалётаў хутка і ў аптымальныя агратэхнічныя тэрміны адразу станоўча адбіваецца на ўраджаі, пераконваюць спецыялісты.

Цяпер уласныя авіягрупы маюць у Магілёўскай вобласці тры сельскія гаспадаркі: «Бель» у Крычаўскім раёне, «Рассвет» у Кіраўскім і «Зара» ў Магілёўскім. А самалёты «Зары» цяпер яшчэ дапамагаюць суседзям з Горацкага раёна — сельскай гаспадарцы «Аўсянка».

Ілона ІВАНОВА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НІЧОГА НЕ БОЙЦЕСЯ!»

Фота БЕЛТА.

НАША краіна цяпер перажывае не самыя лёгкія часы. Усе мы задаёмся няпростымі пытаннямі. Адказаў на іх чакалі ад паслання Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ, з якім ён звярнуўся да народа і парламента.

ГОДНЫ АДПОР

— Беларусь падвяргаецца масіраванаму ціску. Спачатку палітычныя пагрозы, непрыманне вынікаў апошняй прэзідэнцкай кампаніі, спісы невыязных, эканамічныя санкцыі. Затым раздуванне ажыятажу, панікі на валютным і спажывецкім рынках з падачы розных тутэйшых і замежных аналітыкаў. Потым скокі на касцях у сувязі з падзеямі на станцыі метро «Кастрычніцкая». Усё гэта, па сутнасці, звёны аднаго ланцуга, — пераканаць беларускі лідар.

Ён робіць выснову, што некаму вельмі хочацца дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне, пасеяць хаос, недавер людзей да ўлады, каб потым праблемамі, што ўзнікаюць, як зашмаргай задушыць нашу краіну, нашу незалежнасць, развязаць рукі для прамога ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы і дыктаваць волю беларускаму народу. Але калі нас спрабаваць нахіліць, мы будзем як мінімум супраціўляцца...

Прэзідэнцкія выбары, на думку кіраўніка беларускай дзяржавы, выявілі двайныя стандарты заходніх дэмакратый.

— Дэмакратыя на экспарт — гэта асаблівыя рэцэпты, якія вядуць на справе да аслаблення патэнцыялу дзяржаў праз анархію, масавыя беспарадкі, эканамічны калапс. Многія нашы суседзі па постсавецкай прасторы і не толькі ўжо балюча адчулі гэта на сабе.

А беларускі народ, які спазнаў за сваю гісторыю шмат цяжкіх выпрабаванняў, у тым ліку фашысцкі генацыд Другой сусветнай вайны і чарнобыльскую катастрофу, «на спалох не возьмеш і байкамі пра неабходнасць каляровай рэвалюцыі ды злом палітычнай сістэмы не падманеш», мяркуе Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, шчырай удзячнасці заслугоўваюць беларускі народ, канструктыўна настроеныя грамадскія арганізацыі і нашы праваахоўныя органы за тое, што не дапусцілі разбурэння дзяржавы, далі годны адпор авантурыстам ад палітыкі і пагромшчыкам.

— Як умелі, так і далі, — адзначыў Прэзідэнт, — але сумленна і шчыра.

І надалей не атрымаецца зламаць краіну.

— Любую пятую, шостую, дваццаць пятую калону мы знішчым. На гэта ў нас дастаткова рэсурсаў. І тут няма нічога агульнага з тым, што дыктатар хоча зламаць грамадства, нічога падобнага. Толькі Канстытуцыя, канстытуцыйныя абавязкі Прэзідэнта. І я буду дзейнічаць у адпаведнасці з Канстытуцыяй, нават калі дзеля гэтага мне давядзецца пакласці сваё жыццё. Шкурнай пазіцыі ў Прэзідэнта няма. І ніколі не будзе.

Колькі слоў сказаў кіраўнік дзяржавы і пра яшчэ адну выбарчую кампанію — парламенцкую, якая чакае краіну налета. Наступныя выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў пройдуць па дзейных правілах. Пераходу на сістэму партыйных спісаў у блізкай будучыні не адбудзецца. Часу засталося не так шмат, каб ламаць дзейную выбарчую сістэму. Аднак Прэзідэнт не выключае яе карэкціровак у далейшым.

На жаль, адзначыў ён, на Захадзе ўкаранілася памылковае меркаванне аб тым, што ў Беларусі толькі апазіцыйныя партыі і нефармальныя арганізацыі складаюць грамадзянскую супольнасць. У той час як апорамі грамадства, на думку беларускага лідара, з'яўляюцца Саветы дэпутатаў, прафсаюзы, ветэранскія, моладзевыя і жаночыя арганізацыі.

— Магчыма, на нейкім этапе мы дапоўнім іх і палітычнымі партыямі, як сёння прапануецца некаторымі палітыкамі. Але мы не павінны ставіць калёсы наперадзе каня, — упэўнены Прэзідэнт. — Партыя толькі тады можа стаць значнай цэментуючай сілай у грамадстве, калі ініцыятыва аб яе стварэнні ідзе знізу — ад саміх грамадзян.

БЯСПЕКА — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

Любая крытычная сітуацыя — гэта заўжды пажытак для роздуму, для аналізу і глабальных высноў на будучыню. Жудасны тэракт у сталічным метро — не выключэнне. Беларускі лідар падкрэсліў, што з трагічных падзей усім варта вынесці сур'ёзныя ўрокі: і органам улады, і сілавым структурам, і працоўным калектывам, і простым людзям. І самы першы ўрок — пільнасць.

— Кожны чалавек павінен адчуваць сваю адказнасць за бяспеку і стабільнасць у краіне, — пераканаць Прэзідэнт. — Спакой і стабільнасць у апошнія гады нас закалыхалі. Мы недаацанілі новыя пагрозы, уключаючы тэрарызм. Тут неабходна кардынальна змяняць стаўленне да жыцця, быць больш уважлівымі, асцярожнымі, не ігнараваць любую небяспеку.

Лідар краіны мяркуе, што кожны кіраўнік: ці то дырэктар школы, ці то галоўны ўрач бальніцы, ці ўладальнік гіпермаркета — павінен браць на сябе долю адказнасці за бяспеку.

— Працуючы на вытворчасці, наведваючы футбольны матч, сядаючы на цягнік ці ў самалёт, грамадзянін павінен адчуваць і ведаць, што яму нічога не пагражае.

Кожная крытычная сітуацыя — таксама напамін пра тое, што варта трымацца адзін аднаго.

— Другі ўрок — згуртаванасць людзей, узаемадапамога і падтрымка ў пераадоленні нягод і выпрабаванняў, — даводзіць кіраўнік дзяржавы. — Добры прыклад паказалі нашы суграмадзяне, калі пасля выбуху ў метро не паддаліся панікі, не сталі звар'яцелым натоўпам, а дапамагалі адзін аднаму.

Бо «ўсе мы ў адной лодцы, усе мы бліжэй, чым браты». А самая глабальная выснова, бадай, тая, што неабходна стварацца такую атмасферу, «каб злачынцы не знаходзілі сабе месца ў нашым грамадстве».

Выканаўцы тэракта выкрытыя, але ўсіх нас трывожыць пытанне «Чаму?». За што нашай ціхай і ветлай краіне такое?

— Да гэтага тэрарыстычнага акта мы пакуль не знайшлі ніякіх шляхоў ні крыміналу, ні бандытаў, ні палітыкаў. У нас пакуль няма такіх фактаў, каб іх абвінавачваць. Але мы разглядаем усе версіі. Нам трэба ведаць, хто стаяў за гэтымі людзьмі, калі стаяў, — кажа Прэзідэнт.

Ён запэўнівае:

— Жывіце спакойна, як жылі. Тэракт — не вынік сістэмных памылак і пралікаў.

Кіраўнік дзяржавы пераканаць, што «ніякай бяспекі мы ў краіне не страцілі», проста «ў сям'і не без выродка»...

РОСТ ЦЭН НЕ ТАКІ СТРАШНЫ, ЯК ІХ ЗАМАРОЖВАННЕ?

І яшчэ пра набалелае — рост цэн.

— Вядома, гэта з'ява не падабаецца людзям. Аднак у эканоміцы яна непазбежная, — кажа кіраўнік краіны. — Замарожванне цэн прывяло б да значна больш сур'ёзных вынікаў.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі няма неабходнасці павышаць цэны на некаторыя тавары першай неабходнасці. Аднак пачаўся масавы адток гэтых тавараў.

— Так было, дарэчы, з цукрам, — згадвае Прэзідэнт. — Гэта ўсё з Мінска пачыналася і тут завяршалася, у рэгіёнах гэтага не было. Нехай мінчане прымуць гэты папрок на сябе: мяшкамі пачалі вывозіць. Праз суткі гэтыя мяшкі пайшлі праз расійскую, украінскую граніцы, і не толькі з цукрам. Дык як змагацца супраць гэтага, калі ў нас сёння асобныя тавары, у тым ліку цукар, у 2 — 3 разы ніжэйшыя па цане, чым у суседніх дзяржавах. У нас жа граніца адкрытая.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што на фарміраванне цэн аказваюць уплыў знешнія фактары.

— Цэны не мы фарміруем, фарміруюць цэны за нас. Так, мы не фарміруем цану на нафту. Тыя, хто сёння прадае нафту, на гэтым нажываюцца.

У Расіі, скажам, велізарныя паступленні ад продажу энергарэсурсаў, ад сыравіны. «У нас гэтага няма, і мы вельмі неабаронены ў гэтым плане, мы ўсё гэта купляем», — дадае Прэзідэнт.

На думку беларускага лідара, пры наяўным становішчы спраў неабходныя толькі эканамічныя метады і ўраўнаважванне.

— Трэба, каб грошы ад павышэння цэн траплялі таму, каму яны павінны трапіць, — не спекулянтам, прайдзісветам, а менавіта людзям, якія вырабляюць гэту прадукцыю, — акцэнтуе А. Лукашэнка. — Калі ўзнялі на цукар цану, каб ураўнаважыць рынак, давайце аддадзім сялянам гэтыя грошы, накіруем іх у ахову здароўя, у адукацыю аддадзім — гэта будзе для ўсіх людзей, давайце.

РАЎНАВАЖНЫ ВАЛЮТНЫ КУРС

Адной з прычын складанасцяў на валютным рынку Прэзідэнт назваў дысбаланс знешняга гандлю. Паводле яго слоў, пры 11-працэнтным росце ВУП і яшчэ большым тэмпе росту прамысловай вытворчасці выручка, што паступае ў краіну ад экспарту выраблennай прадукцыі, не пакрывае ўнутранага попыту на замежную валюту. У многім сітуацыя абумоўлена знешнімі прычынамі.

— Істотна падскочылі цэны на метал, іншую сыравіну і рэсурсы. І сродкаў ад продажу тавараў нам не хапае, каб аплачваць спажываемыя рэсурсы. У выніку — высокае адмоўнае сальда знешняга гандлю пры нізкім прытоку замежнага капіталу, — канстатуе кіраўнік дзяржавы.

Пэўную ролю ў наяўнай эканамічнай сітуацыі, паводле яго слоў, адыграў і значны адток валюты на куплю людзьмі легкавых аўтамабіляў і іншай імпартнай тэхнікі за мяжой.

— Гэтыя і іншыя фактары прывялі да таго, што сёння дысбаланс знешняга гандлю набывае пагражальныя памеры. У яго аснове — структурныя неадпаведнасці вытворчасці рэаліям сучаснай эканомікі і рынкаў.

Ён таксама звярнуў увагу на безадказнае стаўленне да выкарыстання паступаючай у краіну валюты, якую трэба накіроўваць на рэалізацыю высокаэфектыўных акупных праектаў, пашырэнне высокарэнтабельных вытворчасцяў.

Для таго каб паспяхова здаць экзамены, эканамічнаму блоку краіны неабходна, паводле яго выразу, па-першае, ліквідаваць у самыя кароткія тэрміны дыспрапорцыі ў эканоміцы, што ўтварыліся ў перыяд сусветнага крызісу і далейшага аднаўлення, выйсці на раўнаважны валютны курс.

Таксама Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў забяспечыць высокія тэмпы збалансаванага эканамічнага росту, фарміраванне ў краіне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату і прыцягненне ў краіну саліднага міжнароднага капіталу, стварэнне сучаснай, цалкам інавацыйнай структуры вытворчасці.

Прэзідэнт нагадаў, што, фарміруючы новы склад урада, прызначаючы новага прэм'ер-міністра, даўшы амаль поўную свабоду для ініцыятывы, ён разлічваў, што яны без разгойдвання, аператыўна і эфектыўна праявяць свае здольнасці. «Пакуль гэты працэс зацягнуўся. Хоць папярэджваў, што ў новых умовах трэба будзе працаваць напружана і адказна», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. «Так, можна спасылацца на рост цэн энергарэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў. Ну і што з таго? Ну, будзем спасылацца. Ад гэтага ж лягчэй не стане. Трэба шукаць выхад у любой сітуацыі, каб абараніць краіну, захаваць эканоміку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

ДА ЎЗРОЎНЮ ПЕРАДАВЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІН

Прэзідэнт акцэнтаваў, што цяпер Беларусь пераходзіць да новага этапа будаўніцтва дзяржавы, які характарызуецца лібералізацыяй эканомікі і больш інтэнсіўным развіццём прадпрымальніцтва. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь нацэлена стаць дзяржавай з высокаразвітой эканомікай, камфортнай, бяспечнай і паспяховай. Таму ў бліжэйшай перспектыве трэба будзе зрабіць стаўку на інавацыі, інвестыцыі і ініцыятыву. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што павысіць прадпрымальнасць, ініцыятыву і эканамічную актыўнасць грамадзян немагчыма без адэкватнага павелічэння іх ролі ў фарміраванні рашэнняў па сацыяльна-эканамічных праблемах жыцця грамадства. Аднак гэта не азначае аслаблення выбудаванай цягам гадоў кіраўніцкай вертыкалі.

— У адпаведнасці з Канстытуцыяй, асновай палітычнай сістэмы нашай краіны з'яўляецца прэзідэнцкая ўлада як гарант стабільнасці і паспяховай рэалізацыі любых пераўтварэнняў. Гэта галоўная асабліваць беларускай мадэлі развіцця краіны ў пераходны перыяд. І яна яшчэ доўга будзе захоўваць сваю актуальнасць, — запэўнівае А. Лукашэнка.

Аднак кожны грамадзянін павінен ведаць, што ўяўляе сабой вышэйшую каштоўнасць для сваёй краіны, а абарона яго законных правоў і свабод — першаасноўна дзяржаўнай палітыкі.

— Улада слухае і чуе спадзяванні людзей і заўсёды будзе працаваць у інтарэсах чалавека, — падкрэслівае Прэзідэнт.

А бягучая пяцігодка павінна стаць для Беларусі этапам выхаду на ўзровень перадавых еўрапейскіх краін, пераканаць кіраўнік дзяржавы. Абудзіць схаваныя крыніцы энергіі і сілы, паводле яго слоў, — галоўная задача аб'яўленага Года прадпрымальнасці. Выкараніўшы расхлябанасць, непаваротлівасць, марудлівасць, боязь рызыкаваць, павысіўшы адказнасць і дысцыпліну, мы, несумненна, даб'ёмся ўсяго таго, што задумана. Для гэтага ў нас ёсць і магчымасці, і сілы, а самае галоўнае — жаданне.

«МАЛЕНЬКІЯ ПРЭЗІДЭНТЫ»

Прадпрыемлівымі павінны быць і дзяржаўныя службоўцы. На яго думку, многія кіраўнікі прадпрыемстваў і чыноўнікі так прывыклі, што за іх усё вырашае Прэзідэнт і ўрад, што самі ўжо не хочуць і не здольны думаць, тым больш працаваць самастойна, не кажучы ўжо аб тым, каб прапаноўваць эфектыўныя, канкурэнтаздольныя ідэі. Ён нават параіў ім пачаць з сябе, з сваіх рабочых месцаў, з кантролю за выкананнем даручэнняў, з ліквідацыі бюракратычных перашкод, з барацьбы з карупцыяй.

— Калі губернатар і міністр з'яўляюцца ключавымі фігурамі ў краіне ў плане адказнасці і цяжару нагрузкі, якая кладзецца на ўсіх чыноўнікаў, то старшынь гар- і райвыканкамаў не відаць. Прынамсі, я іх не бачу, — адзначае беларускі лідар.

У той час, як яны павінны быць «маленькімі прэзідэнтамі», якія нясуць усю адказнасць за стан спраў у сваім рэгіёне. «Яны павінны кашу заварваць, і не павінны бегаць за чыноўнікам зверху і ў рот яму глядзець», — даводзіць кіраўнік краіны. Паводле яго выразу, тэракт у сталічным метро стаў апошняй кропляй у чашы цярпення адносна кіраўнікоў прадпрыемстваў.

— Вы гэта адчуваеце. Адчуеце яшчэ больш. Наіск будзе не проста катастрафічны — невыносны.

Кіраўнікам трэба не дзесьці раз'язджаць па краіне на службовых аўтамабілях, а звярнуць увагу на вытворчасць, на тое, чым займаюцца іх падначаленыя, — нагадвае беларускі лідар.

— Зарабляць трэба на тым, чым адарыла нас прырода. Прадукты харчавання на сусветным рынку даражэюць і будуць даражэць. Таму важнейшая задача — атрымаць з гэтай сітуацыі максімальную выгаду. Да канца пяцігодкі аб'ём экспарту беларускіх прадуктаў харчавання павінен скласці не менш як $7 млрд, — даводзіць Прэзідэнт.

СТАР. 2

Калектыву газеты «Чырвоная змена»

Паважаныя сябры!

Сёння ў жыцці вашага выдання надзвычай важная падзея — 90-годдзе з дня выхаду ў свет першага нумара газеты «Чырвоная змена».

На працягу сваёй шматгадовай гісторыі выданне было сапраўдным летапісам маладзёжнага руху нашай краіны. Газета заўсёды заставалася разам са сваімі чытачамі — і ў мірным жыцці, і ў гады ваеннага ліхалецця.

Галоўнымі задачамі беларускамоўнага маладзёжнага выдання сёння з'яўляюцца сцвярджэнне высокіх маральных ідэалаў, выхаванне ў моладзі пачуцця патрыятызму, духоўнасці, грамадзянскай адказнасці.

Шчыра жадаю вам моцнага здароўя і дабрабыту, творчага натхнення і ўдзячных чытачоў.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь А. ПРАЛЯСКОЎСКІ.

21 красавіка 2011 г.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗЛАДЗЕЙКА «ЎЗЯЛА ІНТЭРВ'Ю» Ў БАБУЛІ

Апошнюю — жыхарку вёскі Мястэчка Пастаўскага раёна — у выніку звязалі, заклеілі рот скотчам і забралі ў яе тысячу еўра і мільён беларускіх рублёў.

Як паведаміла «Звяздзе» **Наталля ЯРОМЕНКА, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў на крымінальных справах і аналізе судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці**, 34-гадовая дама (раней судзімая за крадзеж), прадставілася бабулі журналісткай. Яна мела двух напарнікаў — адзін з іх грузін па нацыянальнасці, другі — наш зямляк, раней не судзімы грамадзянін 1975 года нараджэння. Усе яны — «гастралёры», жыхары Баранавічаў і Баранавіцкага раёна.

Прыехалі ў Пастаўскі раён на машыне аднаго з удзельнікаў гэтай крымінальнай гісторыі. Згодна з матэрыяламі следства, раней злачынцы пацярпелую не ведалі. Відаць, проста вырашылі наўздагад выбраць «мішэнь». Калі бабуля адчыніла дзверы «журналісткі», два яе «калегі» ў масках таксама ўвайшлі ў дом. Бабулю прывязалі да стула, пачалі шукаць грошы...

Знайшлі пад... швейнай машынкай. Прыгаворам суда злачынцаў абавязалі кампенсаваць пацярпелай нанесеную ёй матэрыяльную страту. А таксама абмежавалі волю «журналісткі» тэрмінам на чатыры гады. Раней не судзімага напарніка накіравалі на чатыры гады ў папраўчую ўстанову агульнага рэжыму, а выхадзец з Каўказа правядзе за дротам таксама чатыры гады, але ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

І ЗНОЎ...

Вяртаецца тое, што яшчэ нядаўна здавалася даўно пройдзеным этапам. І зноў «гараць» удзельнікі незаконных валютных аперацый.

Супрацоўнікі УКДБ па Гродзенскай вобласці сумесна з работнікамі міліцыі затрымалі ў Мастах начальніка змены аднаго з мясцовых прадпрыемстваў і непрацуючага жыхара абласнога цэнтра. Згодна з дзейным заканадаўствам, ім пагражае не толькі канфіскацыя прадмета адміністрацыйнага правапарушэння (а гэта 4,5 мільёна беларускіх рублёў, 1 тысяча расійскіх рублёў і 1184 долары ЗША), але і штраф у памеры 50—300 базавых велічынь.

НЕСПРЫЯЛЬНЫ ФІНАЛ «СПРЫЯЛЬНАГА ВЫРАШЭННЯ ПЫТАННЯЎ»

Да сямі гадоў пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму і канфіскацыяй маёмасці суд прыгаварыў былога дырэктара адной з раённых структур аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў», паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

Сёлета ў студзені 61-гадовы кіраўнік быў затрыманы супрацоўнікамі дзяржбяспекі і міліцыі ў момант атрымання хабару ў памеры 4 тысяч долараў за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзяць у яго кампетэнцыю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У ВАЛЮТЧЫКА КАНФІСКАВАЛІ 30 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

У дачыненні да 46-гадовага валютчыка распачата крымінальная справа аб незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці ўпраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці.

«У выніку кантрольных мерапрыемстваў устаноўлена, што ён на працягу 2010 года і насуперак дзейнаму заканадаўству займаўся набыццём, продажам і абменам замежнай валюты і атрымаў ад гэтай дзейнасці даход у 76 мільёнаў рублёў,» — гаворыцца ў інфармацыйным паведамленні УДФР. Кліентамі валютчыка былі не толькі выпадковыя грамадзяне, але (на пастаяннай аснове) індывідуальныя прадпрымальнікі і прадстаўнікі камерцыйных структур. На момант затрымання пры ім знайшлі і канфіскавалі 30 тысяч долараў. УДФР у сувязі з гэтым звяртае ўвагу на тое, што пад адказнасць за парушэнне парадку й валютных аперацыях падпадаюць не толькі самі валютчыкі, але і грамадзяне, якія карыстаюцца іх паслугамі: ім пагражае адміністрацыйны штраф да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй грошай.

БАЙКЕРЫ АДКРЫЛІ СЕЗОН

Больш за 60 байкераў зрабілі выставу сваіх магутных і хуткасных «жалезных коней» каля гіпермаркета ў Магілёве. Гараджане разглядалі матацыклы і фатаграфаваліся на іх фоне. Інспектары ДАІ нагадвалі байкерам пра неабходнасць прытрымлівацца правілаў дарожнага руху, быць культурнымі і ветлівымі на дарогах, не перавышаць дазволенай хуткасці.

— Хочаш доўга жыць — умей добра ездзіць, — пагаджаліся бывалыя аматары матацыклаў, але і звярталіся з просьбамі да аўтамабілістаў быць уважлівымі да іх. Байкерскі сезон адкрыўся ўрачыста і афіцыйна. Мотапрабег па Магілёве са сцягамі адбыўся ў суправаджэнні аўтамабіляў ДАІ. Фінішавала калона байкераў каля храма ў вёсцы Вейна, дзе свой уклад у спрыянне бяспецы на дарогах зрабіў праваслаўны святар і асвяціў усю мотатэхніку.

Ілона ІВАНОВА.

Фота прадстаўлена Магілёўскай ДАІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Банк торговый капитал
Закрытое акционерное общество

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2011 г.

ЗАО «ТКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2011	01.04.2010
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	5 063,2	2 768,6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	6 505,6	34 893,4
5	Средства в банках	1104	961 061,0	102 140,4
6	Ценные бумаги	1105	96 515,3	81 490,0
7	Кредиты клиентам	1106	78 538,0	15 579,2
8	Производные финансовые активы	1107	20 012,1	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	11 406,8	581,3
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	51 031,8	2 385,3
13	ИТОГО активы	11	1 230 133,8	239 838,2
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	-	-
16	Средства банков	1202	590 825,0	194 837,1
17	Средства клиентов	1203	189 882,5	6 871,7
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	-	-
19	Производные финансовые обязательства	1205	3 133,6	5 994,5
20	Прочие обязательства	1206	317 988,5	580,6
21	ВСЕГО обязательства	120	1 101 829,6	208 283,9
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	110 588,2	29 412,4
24	Эмиссионный доход	1212	167,6	-
25	Резервный фонд	1213	13 108,6	1 346,1
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	(1 562,2)	0,2
27	Накопленная прибыль	1215	6 002,0	795,6
28	ВСЕГО капитал	121	128 304,2	31 554,3
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	1 230 133,8	239 838,2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2011 г.

ЗАО «ТКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2011	01.04.2010
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	10 762,9	5 157,7
2	Процентные расходы	2012	3 730,2	1 044,7
3	Чистые процентные доходы	201	7 032,7	4 113,0
4	Комиссионные доходы	2021	2 506,3	227,7
5	Комиссионные расходы	2022	596,5	94,8
6	Чистые комиссионные доходы	202	1 909,8	132,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(31,0)	873,3
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(18 670,2)	1 766,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	22 049,1	(4 344,4)
11	Чистые отчисления в резервы	207	1 891,1	356,1
12	Прочие доходы	208	15,4	3,8
13	Операционные расходы	209	4 460,1	1 450,8
14	Прочие расходы	210	102,6	92,3
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	5 852,0	645,6
16	Налог на прибыль	212	-	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	5 852,0	645,6

Председатель Правления **А.Б. Веретельников**

Главный бухгалтер **И.Л. Бурко**

14 апреля 2011 г.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 30 от 12.09.2008 г. УНП 807000163.

Фота БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.04.2011 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	3 044,00	1 чэшская крона	183,82
▲ 1 еўра	4 453,98	1 польскі злоты	1 118,11
1 латвійскі лат	6 274,35	▲ 1 расійскі рубель	108,95
1 літоўскі літ	1 289,20	1 украінская грыўня	381,62

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ

USD	27,9398
10 UAH	35,0013
10000 BYR	91,4260
EUR	40,8117

АГЕНЦТВА УРАДАВАГА ГРАМАДЗЯНА

«ЗВЯЗДА» — ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПАРТНЁР МІЖНАРОДНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ «ЦЫВІЛЬНАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ВАЙНЕ»

МІЖНАРОДНАЯ практычная канферэнцыя на тэму нацысцкіх рэпрэсій у гады Другой сусветнай вайны пройдзе ў Мінску 15—17 мая 2012 года. Пра гэта журналістам паведаміў дырэктар музея гісторыі ВАВ Сяргей АЗАРОНАК. Такія канферэнцыі праводзяцца кожныя два гады ў розных краінах Еўропы: першая была ў 2006 годзе ў нямецкім горадзе Бон, у 2008 — у Чэхіі, у 2010 годзе — у Славакіі.

— Летась дэлегацыя нашага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выступала на аналагічнай міжнароднай канферэнцыі ў славацкім горадзе Банска Быстрыца: мы расказвалі там пра тое, што беларусы вытрывалі ў гады Другой сусветнай вайны. На жаль, не ўсе ведалі, што да сёння 286 вёсак не адноўлены пасля вайны, пра тое, што ў некаторых раёнах Віцебшчыны загінуў падчас нямецкай акупацыі кожны другі жыхар... Гэтыя страшныя лічбы былі падставай для таго, каб у 2012 годзе такая ж канферэнцыя была праведзена ў нас у Беларусі, — сказаў Сяргей Азаронак і дадаў, што зараз у Мінск прыбыла працоўная група, якая займаецца тэхнічным і арганізацыйным бокам будучай канферэнцыі. — Гэтую ініцыятыву поўнасцю падтрымлівае Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а газета «Звязда» з'яўляецца інфармацыйным спонсарам гэтага найважнейшага праекта. Я мяркую, што мы зробім усё, каб у Беларусі канферэнцыя была арганізавана і прайшла на высокім узроўні.

— У нашай канферэнцыі ў 2010 годзе ўдзельнічала 14 краін Еўропы, і мы вельмі рады, што ўпершыню сярод удзельнікаў былі і краіны былога Савецкага Саюза — Беларусь, Украіна і Расія, — сказаў **Станіслаў МІЧЭЎ, дырэктар Музея Славацкага народнага паўстання (горад Банска Быстрыца, Славакія)**. — Там мы вялі гаворку пра тое, каб у 2012 годзе канферэнцыя была на тэрыторыі Беларусі, бо мы летась пабачылі Хатынь, пабачылі музей Вялікай Айчыннай вайны — беларускі народ панёс вельмі вялікія страты ў гады Другой сусветнай вайны. Тэмы такіх канферэнцый — не толькі вайна, але і сучаснасць: размовы пра тое, як нам трэба ў Еўропе разам жыць — не ў вайне, а ў міры. Што тычыцца тэмы канферэнцыі ў Мінску, то мы хочам паказаць, як цяжка было насельніцтву ў вайну, як цяжка было жыць моладзі і дзецям.

Такім чынам, тэмай канферэнцыі наступнага года ў Мінску была выбрана «Цывільнае насельніцтва ў вайне». Паралельна будзе праводзіцца і моладзевая секцыя з назвай «Моладзь і дзеці ў гады Другой сусветнай вайны».

— Мы будзем актыўна ўцягваць моладзь у гэты даследчы адукацыйны праект, бо мы рэальна пабачылі на канферэнцыі ў Славакіі, наколькі існуе жывая зацікаўленасць у моладзі, наколькі там былі складаныя дыспуты, — расказвае Сяргей Азаронак. — Я прама скажу: не ўсе там актыўна выступалі ў падтрымку Чырвонай Арміі, быў і другі бок, які даказваў свой пункт гледжання. Але самае галоўнае, што моладзь не з акопаў, а з дапамогай аргументаў і фактаў даказвала свае перакананні. Гэта было проста цудоўна, я такога актыўнага супрацьстаяння думак яшчэ не бачыў, прычым, падкрэслю, менавіта дружалюбнага супрацьстаяння.

Па словах Сяргей Азаронка, на міжнародную канферэнцыю ў Мінску чакаюцца прадстаўнікі як мінімум 12 краін: агульны лік удзельнікаў плануецца да 300 у дарослай секцыі і да 150 у моладзевай. Праводзіцца мерапрыемства будзе пераважна на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (будуць выдзелены дзве залы, разлічаныя на 500 і на 150 чалавек), таксама разглядаецца магчымасць удзелу ў канферэнцыі ў рэжыме анлайн праз інтэрнэт для тых, хто не зможа па нейкіх прычынах прыехаць у Мінск.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НІЧОГА НЕ БОЙЦЕСЯ!»

СЯМ'Я — ГЭТА НАША ЎСЁ

Паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі Прэзідэнт назваў адным з прыярытэтаў айчыннай сацыяльнай палітыкі. Нараджальнасць няўхільна расце. За апошнія пяць гадоў нарадзіліся больш за паўмільёна дзяцей. Тым не менш, карэнным чынам змяніць сітуацыю пакуль не ўдалося: наступствы дэмаграфічнага спаду 1990-х гадоў будуць праяўляцца яшчэ доўгі час.

— Мы павінны зрабіць усё магчымае для іх пераадолення, — даводзіць беларускі лідар.

Ён зрабіў акцэнт на тым, што маладыя людзі хочуць мець дваіх і больш дзяцей, і гэта пацвярджаецца сацыялагічнымі даследаваннямі. Адпаведна, «задача дзяржавы — стварыць умовы, калі пры нараджэнні другога дзіцяці ўзровень даходу сям'і не будзе зніжацца». Кіраўнік краіны дадаў таксама, што «ўраду трэба пакласці на стол праграму падтрымкі мацярынства і дзяцінства».

ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ — БЛІЖЭЙ ДА ДОМУ

У Беларусі будуецца шмат жылля, але трэба паглядзець аптымальныя варыянты — каб дзіцячыя сады былі побач з домам бацькоў. «Нам больш выгадна, каб бацькі працавалі, а дзеці былі забяспечаны доглядам у дзіцячым садзе. Будуючы нармальныя дзіцячыя дашкольныя ўстановы, мы такім чынам і сем'і падтрымаем, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэты аспект трэба разглядаць як частку комплекснага вырашэння дэмаграфічнай праблемы».

Прэзідэнт даручыў губернатарам і мэру Мінска ўзяць гэта пытанне пад свой асабісты кантроль. «Трэба зрабіць так, каб не было праблем з уладкаваннем малышоў у дзіцячыя сады побач з домам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА ПАВІННА ЗМЯНІЦЦА

«Мы маладзёжную палітыку ажыццяўляем ад выпадку да выпадку, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але з другога боку трэба ўзмацніць за гэта адказнасць».

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што трэба разабрацца з узроўнем выкладання і выхавання ў прыватных ВНУ. «Дзяўчына, якое мае дачыненне да ажыццяўлення страшнага тэракта — студэнтка прыватнай ВНУ, — расстлумачыў ён. — Гэта амаральны чалавек, які спіўся, а дзяўчыне толькі 21-22 гады».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, калі праз прызму тэракта паглядзелі на грамадства, то выявілася шмат адмоўных момантаў, звязаных з ужываннем моладзю наркотыкаў, цягі да курэння. «Гэтыя з'явы сёння трэба выпальваць гарачым жалезам. А заўтра патрэбна мэтанакіраваная праграма, каб гэтага пазбегнуць, інакш будзем бітыя на кожным кроку, на кожным квадратным метры, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы атрымаем тое, што маюць некаторыя нашы суседзі, таму трэба спыніць гэту жудасную хвалю. Тым больш што добрых прыкладаў мора — разумных, таленавітых, прыстойных студэнтаў, навучэнцаў ПТВ, вучняў школ».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што грамадскім арганізацыям трэба працаваць не ад выпадку да выпадку, а сістэмна. Што датычыцца БРСМ, то Прэзідэнт ужо не першы раз ставіць задачу: «Вазьміце на сябе тыя праграмы, якія вы можаце пацягнуць, і займайцеся справай, не цягніце туды выпадковых людзей — няхай будзе лічыцца ў арганізацыі менш, але гэта будуць людзі, якія хочуць быць лідарамі, хочуць весці за сабой, самарэалізоўвацца.»

АХОВА ЗДАРОЎЯ Ў БЕЛАРУСІ НЕ ЎСТУПАЕ ЗАМЕЖНЫМ КРАІНАМ

«Пасля тэракта ў мінскім метро ў сталіцу прыехалі вядучыя спецыялісты — медыкі з Расіі і Ізраіля. Яны развялі рукамі: нам тут рабіць няма чаго. Для мяне гэта было вельмі сур'ёзнай узнагародай і пахвалой», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, на ўзбраенні беларускіх спецыялістаў самыя сучасныя метады і тэхналогіі лячэння, а медустановы аснашчаны высокатэхналагічным абсталяваннем.

«Разам з тым увагу трэба надаваць кадравай праблеме. Мы своечасова схапіліся за гэту праблему. Я разумею, што трэба прывязваць урачоў да работы, але не толькі адміністрацыйнымі метадамі, але і эканамічнымі, рабіць так, каб яны працавалі. Тым больш, што сёння наша ахова здароўя ўмее зарабляць», — упэўнены Прэзідэнт.

Закранаючы пытанне аб адукацыі, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што ў гэтай сферы не трэба правадзіць ніякіх ломак і рэформ. «Планшэты або буквары ўводзіць — самі разбірайцеся. Калі гэта сапраўды будзе ўспрынята ў грамадстве — нясхай будзе так, — адзначыў Прэзідэнт. — Але не забывайце аб галоўным: трэба даваць веды, выхоўваць нармальных людзей і гэтаму трэба прысвяціць усё ў школе».

А вось у спорце «не праблема нам сёння тармазнуць на нейкім этапе будаўніцтва новых фізкультурна-аздараўленчых аб'ектаў. Трэба асвоіць тое, што ёсць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, грошы трэба ўкладваць туды, дзе можна атрымаць эфект. Гэта датычыцца і сферы турызму. «Мяне ўсе ў Мінкульце пераконвалі, што замкі і палацы адродзім, адрамантуем, і турысты паедуць. А не паехалі. А вось у просценькую аграсядзібу едуць з задавальненнем і цэлымі сем'ямі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СПЕКУЛЯЦЫІ НА ТЭМУ ПАВЫШЭННЯ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ І АБМЕЖАВАННЯ ПРАВОЎ ПРАЦУЮЧЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ ТРЭБА СПЫНІЦЬ

Вельмі вялікую ўвагу трэба надаць падтрымцы пажылых людзей. Беларусь уваходзіць у лік краін з вельмі нізкім узростам выхаду на пенсію. «Але ні аб якім яго павышэнні або абмежаванні правоў працуючых пенсіянераў размова не ідзе. І ўсялякія спекуляцыі на гэту тэму неабходна спыніць», — падкрэсліў беларускі лідар.

На пенсійныя мэты штогод накіроўваецца каля 9 працэнтаў ВУП, што супастаўна з аналагічнымі паказчыкамі ў эканамічна развітых дзяржавах.

Сучасная дзяржава павінна па-сапраўднаму паклапаціцца і аб інвалідах, прычым не толькі ствараючы магчымасці матэрыяльнага забеспячэння, але і безбар'ернае асяроддзе на вуліцах гарадоў і г.д., сказаў кіраўнік дзяржавы.

ПРЫЯРЫТЭТ — СТВАРЭННЮ НЕВЯЛІКІХ МАБІЛЬНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

«Мы будзем будаваць мабільныя, гібкія, невялікія прадпрыемствы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У нас гіганцкіх прадпрыемстваў дастаткова, дай бог нам іх захаваць, і мы будзем іх захоўваць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вытворчасці ў Беларусі павінны стварацца пад існуючыя ў краіне рэсурсы, у тым ліку мінеральна-сыравінныя. «Памылкі не будзе, калі мы будзем інвесціраваць у тым ліку і свае, бюджэтныя сродкі ў такія прадпрыемствы», — сказаў ён. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў здабычу прэсных падземных вод і іх бутэляванне. «Па якасці ж наша вада адна з лепшых у свеце, выключная вада — эксперты робяць заключэнне. А чаму не прадаём? — задаў слушнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — Чаму возім з Польшчы, Францыі і іншых месц — у нас жа гэтага дабра хапае. Тут трэба ўкладваць сродкі, ствараць новыя прадпрыемствы».

На думку Прэзідэнта, любое прадпрыемства павінна быць мабільным — як вялікае, так і малое. Аналізуючы работу буйных айчынных прамысловых прадпрыемстваў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на пэўным этапе яны павінны ўступаць у кааперацыю з транснацыянальнымі карпарацыямі іншых краін. «У іх ёсць дылерскія сеткі, рынкі збыту, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Але калі яны будуць дзейнічаць у нашых інтарэсах, калі нам прапануюць умовы, якія не апусцяць нашы прадпрыемствы, а дадуць магчымасць развівацца таму ж МТЗ або МАЗу. Але такіх дурняў у свеце няма, канкурэнцыя была, ёсць і будзе».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў Беларусі колькасць буйных прадпрыемстваў значная. «Я прыхільнік сярэдніх і малых гібкіх прадпрыемстваў, — сказаў ён. — Але мы свае прадпрыемствы-гіганты не можам распусціць, разагнаць. Як мяне інфармуюць, нават МАЗ сёння выходзіць на нармальную рэнтабельнасць. Мы сталі канкурэнтаздольныя, значыць, яны штосьці могуць, гэтыя прадпрыемствы, і не штосьці, а шмат што».

АЭС БЫЦЬ!

Трагічныя падзеі ў Японіі ўзнялі новую хвалю дыскусій на тэму ядзернай энергетыкі. У тым ліку і ў Беларусі.

— Каб не было крыватолкаў і непатрэбных інсінуацый на гэту тэму, хачу расставіць усе кропкі над «і». Атамная электрычная станцыя нам жыццёва неабходна! І яна будзе ў Беларусі пабудавана, — цвёрда заявіў Прэзідэнт. — Усе інсінуацыі, якія сёння раскручваюцца ў краіне супраць АЭС, 95 працэнтаў — гэта людзі купленыя. Купленыя нашымі канкурэнтамі. Я ведаю, што гавару, я чытаю гэтыя матэрыялы. Чаму так літоўцы абураны тым, што мы будуем атамную электрастанцыю? Чаму палякі так перажываюць? Дык вы ж самі запланавалі і гатовы будаваць атамную станцыю і ў Літве, і ў Польшчы некалькі блокаў. Чаму тады нам прэтэнзіі прад'яўляеце? Адказ просты — канкурэнцыя! Толькі ў гэтым прычына!

І калі, маўляў, у нас не будзе, у нашым агародзе, атамнай электрастанцыі, а «за плотам іх дзясяткі», хіба ўзмоцніцца наша бяспека? — задаецца рэзонным пытаннем Прэзідэнт. «Не. Дык чаго мы сёння раздуваем гэты пажар?!». Ён таксама запэўнівае, што ў беларускай АЭС будуць выкарыстаныя суперсучасныя тэхналогіі, з гэтым можна параўнаць толькі касмічныя тэхналогіі, і гэта рушыць нашу навуку на новую ступень развіцця.

— Таму я катэгарычна, а не проста настойваю, я прыняў рашэнне і нясу за яго адказнасць: мы будзем будаваць атамную электрастанцыю, чаго б нам гэта ні каштавала! — заяўляе беларускі лідар.

Да таго ж, праект беларускай АЭС адпавядае самым высокім патрабаванням бяспекі і не толькі сённяшняга дня. Немалаважным фактарам застаецца таксама яго цана: значна танней, чым будуюцца такія АЭС у свеце. Новая станцыя забяспечыць краіну больш таннай электраэнергіяй (на 50% таннейшай, скажам, за атрыманую на газавай ЦЭЦ). Плюс, гэта магчымасць стварыць гарантаваны запас ядзернага паліва на доўгі перыяд, на працягу якога краіна не будзе залежаць ні ад якіх кан'юнктурных змяненняў цэн. У дадатак, зніжэнне выкідаў парніковых газаў у атмасферу, што палепшыць экалогію.

ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ І СМІ НЕ ПАВІННЫ ФІНАНСАВАЦЦА З-ЗА МЯЖЫ

«Што б ні гаварылі, усё завяршаецца адным — фінансаванне, фінансаванне, фінансаванне. Гэта іх бізнэс, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І нам трэба гэту кармушку закрыць. Ніякія палітычныя працэсы і нават сродкі масавай інфармацыі не могуць фінансавацца з-за мяжы краіны. Не могуць — і ўсё! Будзе іншая сітуацыя ў дзяржаве, мы па-іншаму паглядзім на гэтыя працэсы. А сёння гэта трэба спыніць».

РЭВАЛЮЦЫІ Ў СВЕЦЕ НІКОМУ НЕ ПАТРЭБНЫ І НІЧОГА НЕ ПРЫНЯСУЦЬ, АКРАМЯ ШКОДЫ

Як нагадаў Аляксандр Лукашэнка, «нас заўсёды называлі рэвалюцыянерамі», «кляпалі» за нашу Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю». Але цяпер Прэзідэнт гаворыць, што «хопіць, не трэба рэвалюцый, вычарпалі ліміт». Пры гэтым ён звярнуў увагу, што самымі заўзятымі рэвалюцыянерамі сёння выступае Захад, у тым ліку ЗША.

«Яны сёння гэту рыторыку нашага Уладзіміра Ільіча Леніна поўнасцю асвоілі і ёй карыстаюцца. Гэта значыць, ім, аказваецца, патрэбны рэвалюцыі. Ну, пажадана, каб гэтыя рэвалюцыі з іх пачыналіся, тады яны зразумелі б, што такое рэвалюцыя, і цану гэтай рэвалюцыі», — лічыць Прэзідэнт.

На яго думку, рэвалюцыя, можа, у перспектыве і прынясе нейкія станоўчыя вынікі, калі яна на іх нацэлена. «Але тое, што адбываецца карэнная ломка адносін, злом дзяржаў, такія рэвалюцыі нікому не патрэбны. І ў бліжэйшай перспектыве яны, акрамя шкоды, нічога не прынясуць, вось пабачыце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

ЕЎРАПЕЙСКІ ТАЙМ-АЎТ... НЕНАДОЎГА

Прэзідэнт таксама закрануў тэму еўрапейскай інтэграцыі. «Нам часта гавораць: «Наперад у Еўропу». Мы чуем гэтыя лозунгі. Нас не трэба ўгаворваць ісці ў Еўропу. Мы ў ёй знаходзімся. І ніколі не імкнуліся адгарадзіцца ад тых каштоўнасцяў, ад усяго добрага і прагрэсіўнага, што напрацавана ў заходнееўрапейскіх дзяржавах, у Еўрасаюзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Больш таго, ён адзначыў, што ў Беларусі цалкам падзяляюць тыя дэмакратычныя ідэі, якімі кіруюцца гэтыя краіны. Многія з гэтых каштоўнасцяў гістарычна напрацаваны і беларускім народам.

— Еўрапейскі саюз — наш бліжэйшы сусед. Так, сёння ў беларуска-еўрапейскіх адносінах узяты тайм-аўт. Думаю, што гэты тайм-аўт, тым не менш, доўга не прадоўжыцца, — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што тыя еўрапейцы, якія даражаць добрасуседствам, добра разумеюць марнасць спроб ізаляцыі беларускай дзяржавы. Прэзідэнт падкрэсліў, што рэспубліка стабільна забяспечвае энергатранзіт у Еўропу, фільтруе патокі нелегальнай міграцыі, блакіруе пранікненне на сумежныя тэрыторыі наркотыкаў і зброі, а таксама ядзерных матэрыялаў.

Трэба актыўна шукаць агульныя падыходы ў супрацоўніцтве з еўрапейскімі партнёрамі і не толькі інтэнсіўна даводзіць аб'ектыўную інфармацыю пра Беларусь, але і проста часцей запрашаць еўрапейцаў да сябе, перакананы кіраўнік дзяржавы.

Аднак скіраванасць на дыялог з Захадам не адмаўляе добрых стасункаў з Усходам. Разумны баланс і шматвектарнасць — вось беларускае крэда ў знешняй палітыцы.

Кіраўнік дзяржавы знайшоў час і для адказаў на пытанні парламентарыяў. Іх цікавілі самыя розныя галіны гаспадаркі і сацыяльнай палітыкі. Ад балансу гарадскога і сельскага насельніцтва да прыярытэтаў у прамысловасці. Нават пра небяспеку знешняй ваеннай пагрозы пыталіся. Нічога не бойцеся! — вось, відаць, галоўны адказ на ўсе балючыя пытанні.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Практыкум

ВОСЬ ТАКІЯ... КАВУНЫ

«Звязда» не раз пісала пра тых, хто вырасціў іх — дзесяцікілаграмовыя, а то і больш — на сваіх прысядзібных ці садовых участках. Малайцы людзі: змаглі! Іншым, дарэчы, таксама хацелася б! Хоць паспрабаваць. Можа, нехта на старонках газеты падзяліўся б досведам?

Просьбу пастаянных падпісчыц газеты А.Л. Мацвіенкі з Мінска, А. Трухан з г.п. Старобін і іншых рэдакцыя адрасавала вядомай аграномцы ***Соф'і КУСЯНКОВАЙ*** *з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна. І, вядома ж, атрымала адказ.*

Найперш выбіраем месца для пасеву. З улікам нашых шырот пажаданы хоць невялікі паўднёвы асветлены ўхіл. Найлепшыя папярэднікі і суседзі — буракі, капуста, найгоршыя — бульба і агуркі. Глеба лёгкая, урадлівая, нейтральнай кіслотнасці (прасцей — без хвашчу і макрыцы).

На ёй з поўначы на поўдзень (так лепш будзе прагравацца створаны «грэбень») на адлегласці не менш чым 1,8 метра адна ад адной робім траншэі і закладваем у іх не зусім перапрэлы гной (ідэальна — конскі) ці кампост з раслінных кампанентаў. У іх большая колькасць азоту. Да таго ж, «даходзячы» ў глебе, яны будуць даваць раслінкам цяпло.

Гэтую «запраўку» праліваем крутым растворам марганцоўкі, закрываем зямлёй (можна плугам, «у склад») і «ўцяпляем». Плёначныя ангарчыкі (з дужак або дошак шырынёй 15 см на адлегласці 25 см адна ад адной) вядома ж, лепш, чым засціланне ўчастка спанбондам, але гэта ўжо справа густу і матэрыяльных магчымасцяў кожнага.

Ёсць метад для лянівых. На грэбні, над будучымі раслінкамі (на адлегласці 60 см адна ад адной) можна, адрэзаўшы дно, умацаваць 5-літровыя пластыкавыя бутэлькі з-пад вады. Праграванне лакальнае. Аднак трэба ведаць, што на 9—10-ы дзень пасля пасадкі пры дастаткова цёплым надвор'і з'явяцца ўсходы, якія нават пры адкрытым корку ў спёку будуць пакутаваць, а то і падгараць. Так што ў пагодныя дні бутэлькі давядзецца здымаць.

Насенне перад пасевам трэба апрацаваць ад вірусных захворванняў, гэта значыць, на пару гадзін змясціць іх у цёмны (не ружовы і не чырвоны) раствор марганцоўкі, потым прамыць і цягам сутак вытрымаць у цёплым месцы, загарнуўшы ў чыстую вільготную анучку.

Дні праз тры пасля падрыхтоўкі і прагравання «грабянёў» робім невялічкія ямкі з улікам таго, каб паміж насеннем і кампостам заставалася 10 см зямлі. Тады пажыўныя рэчывы малады карэньчык будзе браць паступова.

У ямку заліваем вады, кладзём насенне, можна па 2—3 шт... Слабейшыя парасткі потым можна адшчыкнуць (але не вырываць, бо кавуны не любяць нават нязначнага ўмяшання ў сваю каранёвую сістэму, не кажучы ўжо пра перасадку!) прысыпаем 3 см сухой зямлі (на ёй не ўтворыцца шчыльная корка) і зноў накрываем.

Калі сёлета пасеяць кавуны 7—8 мая, то ўсходы з'явяцца недзе 18-га, а ў пачатку чэрвеня расліны ўжо «папаўзуць».

Пасля з'яўлення трох сапраўдных лістоў іх можна падкарміць растворам каравяку. Больш ніякіх падкормак я не раблю. А ўжо азот для нарошчвання масы — крый Божа. Гэта нітраты, нясмачнасць, загніванне.

У пачатку і ў сярэдзіне цвіцення можна апрацаваць раслінкі борнай кіслатой: 10 г на вядро вады.

Укрыццё я здымаю ў сярэдзіне чэрвеня, з надыходам устойлівага цяпла. Калі ўсё добра склалася, завязі на ранніх сартах пойдуць да 20 чэрвеня, на позніх — пасля.

Масу ранніх плады набяруць да сярэдзіны ліпеня, познія — да пачатку жніўня. Каб мець гэтую радасць, трэба ведаць, што кавун, як культура цеплалюбівая, засуху пераносіць лёгка, не любіць перападаў тэмператур, лішняй вільгаці. Пасля таго, як на раслінах пачалі завязвацца плады, я іх увогуле не паліваю (так званы «парніковы эфект» можа справакаваць захворванні). А вось рыхлю часта, асабліва пакуль расліна не распаўзлася і ёсць магчымасць не турбаваць яе.

Можна яшчэ ў грэбні рабіць адтуліны агародніны віламі. Гэта дасць доступ кісларoду да каранёў. Галоўнае, каб расліна не захваркла на пачатку росту, калі яшчэ не ўсталявалася цяпло і здараюцца перапады тэмператур. Стан здароўя можна праверыць, паварушыўшы яе. Калі яна спружыніць — значыць, усё нармальна, калі ж хістаецца, не трымаецца, значыць, карані ўжо пашкоджаны гнілямі. Дапамагчы тады можа раствор марганцоўкі.

У далейшым расліна не застрахавана ад вірусных і бактэрыяльных хвароб. Асабліва шкодны фузарыёз, энтракноз (бурыя плямы на сцяблінах), у выніку чаго расліна страчвае здольнасць сілкавацца і сілкаваць плады.

Для прафілактыкі можна скарыстаць прэпараты, якія змяшчаюць медзь. Не пашкодзяць і стымулятары росту (кшталту экасілу).

Калі кавуны ўжо распаўзліся і пачалі завязвацца, плеці лепш не чапаць (яны гэтага вельмі не любяць, да таго ж на іх утвараюцца карані, якія забяспечваюць дадатковае сілкаванне)...

Час вызначацца з ураджаем. Вялікую колькасць пладоў расліна не зможа забяспечыць усім неабходным. Таму на кожнай лепей пакінуць не больш як тры ягады. На іх тады і самім будзе прыемна паглядзець, і другім паказаць. Лічыцца, што найбольш якасныя плады завязваюцца на асноўным сцябле. Але гэта, як той казаў, не факт. Значыць, варта проста назіраць, хто выходзіць у лідары, і проста пакідаць мацнейшыя. Праўда, з гэтай працэдурай не трэба спяшацца — «лідары» павінны быць кілаграмы па два.

І нарэшце — пра вынікі. Не можа кавун, сартавыя якасці якога прадугледжваюць масу 4 кг, вырасці да 10 кг (нават калі яго «закарміць» нітратным азотам). Таму, выбіраючы насенне, трэба азнаёміцца з характарыстыкамі, вызначыцца з патрэбнымі памерамі і тэрмінамі выспявання. Нават ранні дзесяцікілаграмовы сорт, пакуль набярэ вагу, саспее пазней, чым той, які павінен быць 4 кілаграмы...

З не вельмі буйных (да 4 кг) добра сябе паказваюць «Сахарны», «Огонёк» (летась асобныя былі па 5—6 кг, хоць нічым не карміла). Сама тое — «Астраханскі»: стабільна 6—8 кг, лічы, адна мякаць, прычым вельмі салодкая. Садзіла я і «Мядовы гігант». Сорт ранні, расліна моцная, лісты больш буйныя, плод падоўжаны, скура салатнага колеру. Магчыма, з-за прадугледжанай сортам масы — да 15 кг — дэманструе пэўную самарэгуляцыю: першы плод, які завязаўся, пачынае вельмі хутка набіраць масу, не пакідаючы шанцаў іншым. Прыстойных — па 7—9 кг — на расліне вырастае два. Самы вялікі вырас адзін — 12 кг. Ён быў разрэзаны 18 жніўня — яму спатрэбілася больш часу на рост і выспяванне. Апошні — 6 кг, знятым ляжаў амаль да сярэдзіны кастрычніка. Мяркую, мог бы захавацца да лістапада. Збіраюся паспрабаваць вырошчваць сарты галандскай селекцыі. Хваляць гібрыд «Раманза»...

Мой досвед, вядома ж, не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі. Я назіраю, эксперыментую, раблю высновы: усё ж культура нехарактэрная для нашых шырот. Таму многа нюансаў. Усё мае значэнне: глеба, мясцовасць, год, характар раслінавода і г.д. Таму ўсім цярпення і назіральнасці (лепш пасадзіць некалькі сартоў). І галоўнае — захаваць расліну здаровай на ранніх стадыях росту. Тады абавязкова нешта вырасце! Смачна з'есці!

Абзац

◢ У Гомельскай вобласці пад дзіцячыя дашкольныя ўстановы плануюць адводзіць першыя паверхі жылых новабудоўляў. Такім чынам мяркуецца вырашыць праблему з няхваткай дзіцячых садкоў.

◢ **ААТ «БелАЗ» выпусціла 500-ы самазвал БелАЗ-7530 грузападымальнасцю 220 т. Урачыстае мерапрыемства з гэтай нагоды прайшло на Беларускім аўтамабільным заводзе ў цэху зборкі, выпрабаванняў аўтамабіляў і цягачоў. Юбілейны самазвал будзе пастаўлены ў Расію. Першы самазвал гэтай мадэлі быў выраблены ў 1992 годзе.**

◢ Цягнікі, што рухаюцца па маршруце Масква—Мінск—Варшава—Берлін, з канца гэтага года пойдуць да Парыжа.

◢ **Напярэдадні Вялікадня святочная свежая прадукцыя сталічных хлебазаводаў будзе падвозіцца ў фірмовую сетку Мінскхлебпрама кожную гадзіну. Кулічы і булкі паступаюць у гандлёвую сетку ўжо з 20 красавіка, і да наступнага панядзелка асартымент будзе пастаянна папаўняцца.**

◢ У Мінску 20 красавіка пры правядзенні земляных работ на вуліцы Гало знойдзены аўтамат Калашнікава і 227 патронаў да яго. Праводзіцца праверка.

◢ **Жыхар Бярозаўскага раёна біў жонку і забіў дзіця, якое не нарадзілася. П'яны 43-гадовы жыхар в. Спорава ў лістападзе мінулага года пабіў жонку, якая была на 8-м месяцы цяжарнасці. Некалькі ўдараў ён нанёс ёй у жывот, у выніку ненароджанае дзіця загінула. Суд прыгаварыў мужчыну да 4 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Гэтымі днямі прысуд уступіў у сілу.**

Поўны абзац

◢ У кітайскай правінцыі пачаты незвычайны збор чаю — у ім удзельнічаюць толькі цнатлівыя дзяўчаты, якія зрываюць лісце вуснамі. Як сведчыць кітайская легенда, феі збіралі вуснамі лісты чаю. Потым на пары ад завараных гарбаты яны ўзнімаліся ў неба. Зараз у кітайскай правінцыі Хэнань гэтая цырымонія ператварылася ў цэлую рэкламную акцыю. Як заяўляюць арганізатары збору, да дзяўчат ёсць пэўныя патрабаванні — яны павінны быць цнатлівымі, захоўваць унутраную чысціню, на целе не павінна быць ніякіх шрамаў. Аплата тым, хто працуе, — ад $ 85 у дзень. Прадстаўнік плантацыі Лі Юн расказаў, што збіраць чай такім чынам намнога цяжэй, чым здаецца. Гэта шматгадовая традыцыя, якую не збіраюцца страчваць. Між тым, такі метад збору чаю трапіў пад крытыку праваабаронцаў, якія сцвярджаюць, што кампанія не паважае жанчын.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ГАРЭЛКА — НА БЕРАГ ТУРЭЦКІ

Другім па значнасці напрамкам экспарту беларускай гарэлкі ўжо сёлета можа стаць Турцыя. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Юлія Бальшакова.

Калі летась агульны аб'ём паставак беларускай лікёра-гарэлачнай прадукцыі ў Турцыю склаў 44 тыс. дэкалітраў, то, як чакаецца, сёлета толькі да верасня-кастрычніка (часу заканчэння «высокага» турыстычнага сезона) гэты паказчык выйдзе на адзнаку 120 тыс. дэкалітраў. У прыватнасці, зазначылі ў канцэрне, цяперашні рост цікавасці да нашай алкагольнай прадукцыі тлумачыцца яе параўнальна нізкай цаной і добрай якасцю, якую забяспечыла праведзеная апошнім часам мадэрнізацыя айчынных вытворчасцяў спірту. Прычым, у адрозненне ад мінулага года, экспартныя пастаўкі ў Турцыю сёлета будзе здзяйсняць не толькі РУП «Мінск-Крыштальз», але таксама Віцебскі, Брэсцкі і Гродзенскі лікёра-гарэлачныя заводы.

Дарэчы, цяпер Беларусь пастаўляе сваю алкагольную прадукцыю ў 27 краін свету. Найбольшы аб'ём экспарту прыпадае на дзяржавы Балтыі, апроч таго, значныя аб'ёмы лікёра-гарэлачных вырабаў ідуць у Германію, Італію і Расію.

Сяргей ГРЫБ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

О проведении хозяйственным судом Витебской области публичных торгов по продаже имущества ОАО «Витебский райагросервис» (г. Витебск, ул. Ленинградская, 217), методом повышения начальной цены с минимальным размером шага пять процентов от стоимости имущества.

На торги выставляется следующее имущество:

№ п/п	Название и описание предметов	Оценка, бел. руб. (с учетом НДС)
1.	Станок металлорежущий вертикально-сверлильный инв. № 28	1 387 584 рубля
2.	Станок металлорежущий токарно-винторезный 163 инв. № 15	6 937 920 рублей
